УДК 947.6"1990–1994"

# Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь: распрацоўка, праекты, прыняцце (1990–1994)

**Кур'яновіч А.В.**
***Установа адукацыі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі***
***"Міжнародны ўніверсітэт «МІТСО»", Мінск***

*Пытанні гісторыі распрацоўкі і прыняцця Канстытуцыі незалежнай Беларусі ўжо сталі аб'ектам увагі даследчыкаў, у першую чаргу, навукоўцаў-юрыстаў, некаторых актыўных членаў Канстытуцыйнай камісіі Вярхоўнага Савета Беларусі XII склікання. Айчынная гістарычная навука толькі-толькі падступае да вывучэння дадзенай праблематыкі. Канстытуцыйны працэс у Беларусі перыяду 1990–1994 гг. яшчэ патрабуе ўважлівага вывучэння.*

*Мэта дадзенага навуковага артыкула – раскрыць цэласную карціну канстытуцыйнага працэсу перыяду 1990–1994 гг., яго арганізацыйны ўзровень, формы і спосабы абмеркавання канстытуцыйных праектаў, у тым ліку на аснове прапаноў і заўваг розных ведамстваў, арганізацый, прадпрыемстваў, устаноў, а таксама грамадзян.*

***Матэрыял і метады.*** *Крыніцазнаўчую базу даследавання складаюць арыгінальныя дакументы фондаў Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь. У прыватнасці, гэта стэнаграмы пасяджэнняў сесій Вярхоўнага Савета XII склікання, матэрыялы Канстытуцыйнай камісіі (пратаколы пасяджэнняў, праекты Асноўнага Закона, заўвагі і прапановы да іх).*

*Метадалагічную аснову даследавання склаў сістэмны падыход, паводле якога канстытуцыйны працэс 1990–1994 гг. можна ўявіць як пэўную сістэму з наступнымі элементамі (параметрамі): перадумовы новай Канстытуцыі; Канстытуцыйная камісія; праекты Канстытуцыі; заўвагі і прапановы; механізм і этапы прыняцця Канстытуцыі.*

***Вынікі і іх абмеркаванне.*** *У навуковым артыкуле раскрываецца працэс распрацоўкі праектаў Канстытуцыі незалежнай Беларусі, наступнае іх абмеркаванне і, нарэшце, прыняцце Асноўнага Закона. Звяртаецца ўвага на тое, што канстытуцыйны працэс на ўсім працягу 1990–1994 гг. быў забяспечаны ў арганізацыйна-матэрыяльным, прававым і навукова-інтэлектуальным плане. Упершыню за ўсю гісторыю стварэння беларускіх канстытуцый ў 1990–1994 гг. былі прыцягнутыя высокакваліфікаваныя кадры, кандыдаты і дактары навук.*

*Публічнасць канстытуцыйнага працэсу, апублікаванне праектаў Канстытуцыі ў сродках масавай інфармацыі выклікалі даволі шырокі грамадскі інтарэс. Заўвагі і прапановы садзейнічалі паляпшэнню канстытуцыйнага праекта змястоўна і стылістычна.*

*Тым не менш, канстытуцыйны працэс у 1990–1994 гг. не пазбег калізій. Шмат у чым яны былі звязаны і са стылем работы Вярхоўнага Савета XII склікання, які характарызаваўся зацягваннем прыняцця важных рашэнняў, бясконцымі кансультацыямі і ўзгадненнямі. Наглядна гэта выявілася ў паартыкульным абмеркаванні праекта Канстытуцыі. Экстраардынарны прыём – паіменнае галасаванне, да якога вымушаны былі звярнуцца дэпутаты, – сведчыў аб тупіковасці канстытуцыйнага працэсу.*

***Заключэнне.*** *Такім чынам, галоўная мэта канстытуцыйнага працэсу на Беларусі, пачынаючы з 1994 г., была дасягнута. Новы Асноўны Закон рэспублікі быў ухвалены Вярхоўным Саветам. Але шлях да Канстытуцыі незалежнай Беларусі аказаўся вельмі складаным. Сваю ролю тут адыгралі розныя фактары: недысцыплінаванасць многіх парламентарыяў, іх палітычныя і асабістыя ўзаемаадносіны, прафесійная непадрыхтаванасць і інш. І ўсё ж дэпутаты Вярхоўнага Савета XII склікання змаглі пераадолець амбіцыі і прыняць Канстытуцыю Беларусі. У гэтым іх безумоўная гістарычная заслуга.*

***Ключавыя словы:*** *камісія, праект, дэпутат, галасаванне, дэбаты.*

*(Ученые записки. – 2014. – Том 17. – С. 50–58)*

# Constitution of Republic of Belarus: Development, Projects, Adoption (1990–1994)

**Kurianovich A.V.**
***Education establishment of the Federation of Trade Unions of Belarus***
***"International University «MITSO»", Minsk***

*Issues of history of development and adoption of the Constitution of the independent Belarus have already become object of attention of researchers, first of all, the scientists-lawyers, some active members of the Constitutional Commission of the Supreme Council of Belarus of the XII convocation. The domestic historical science is just approacheing the study of this perspective. The constitutional process in Belarus of the period of 1990–1994 still demands careful studying.*

*Адрас для карэспандэнцыі: e-mail:* deklaration@mail.ru – **А.В. Кур'яновіч**

*The purpose of this scientific article is to reveal a complete picture of the constitutional process of the period of 1990–1994, its organizational level, forms and ways of discussion of the constitutional projects, including, those on the basis of offers and comments of various departments, institutions, enterprises, establishments, and also citizens.*
***Material and methods.*** *The source study of the base of research is made by original documents of funds of National Achive of the Republic of Belarus. In particular, it is shorthand reports of meetings of sessions of the Supreme Council of the XII convocation, materials of the Constitutional Commission (minutes of meetings, drafts of the Basic Law, remarks and the offer to them).*
*The methodological basis of the research was made by system approach. According to such approach, the constitutional process of 1990–1994 can be presented as a certain system with the following elements (parameters): prerequisites of the new Constitution; Constitutional Commission; Constitution drafts; remarks and offers; mechanism and stages of adoption of the Constitution.*
***Findings and their discussion.*** *In the scientific article process of the development of draft constitutions of the independent Belarus, the subsequent their discussion and, at last, adoption of the Country Constitution is revealed. Attention is drawn to the constitutional process throughout 1990–1994 which was provided in the organizational and material, legal and scientific and intellectual ways. For the first time in all the history of creation of the Belarusian Constitutions in 1990–1994 highly qualified personnel, PhDs and doctors of science were involved*
*Publicity of the constitutional process, publishing Draft Constitutions in mass media caused quite wide public interest. Remarks and offers helped to improve the constitutional project substantially and stylistically.*
*Nevertheless, the constitutional process in 1990–1994, didn't avoid collisions. In many respects they were connected and with style of work of the Supreme Council of the XII convocation. This style consisted in prolonging of adoption of important decisions, infinite consultations and coordination. Visually it was shown in discussion of the Draft Constitution on articles. Extraordinary technique of inundated vote to which the MPs were compelled to address, testified to the deadlock of the constitutional process.*
***Conclusion.*** *Thus, the main goal of the constitutional process in Belarus, since 1994, was reached. The new Basic Law of the Republic was approved by the Supreme Council. But the way to the Constitution of the independent Belarus was very difficult. A role was played here by Different factors played the role: indiscipline of many parliamentarians, their political and personal relations with each other, professional unpreparedness, etc. And still deputies of the Supreme Council of the XII convocation could overcome ambitions and adopt the Constitution of Belarus. This is their unconditional historical merit.*
***Key words:*** *commission, project, deputy, vote, debate.*

*(Scientific notes. – 2014. – Vol. 17. – P. 50–58)*

Пытанні гісторыі распрацоўкі і прыняцця Канстытуцыі незалежнай Беларусі ўжо сталі аб’ектам увагі даследчыкаў, у першую чаргу, навукоўцаў-юрыстаў, актыўных членаў Канстытуцыйнай камісіі Вярхоўнага Савета Беларусі XII склікання Г.А. Васілевіча [1] і М.П. Чудакова [2]. Айчынная гістарычная навука толькі-толькі падступае да вывучэння дадзенай праблематыкі: маюць месца і манаграфічныя выданні [3], і асобныя публікацыі [4]. Тым не менш, як справядліва адзначыў адзін з вядучых беларускіх гісторыкаў А.А. Каваленя, канстытуцыйны працэс у Беларусі перыяду 1990–1994 гг. яшчэ патрабуе ўважлівага вывучэння [5, с. 13].

Мэта дадзенага навуковага артыкула – раскрыць цэласную карціну канстытуцыйнага працэсу перыяду 1990–1994 гг., яго арганізацыйны ўзровень, формы і спосабы абмеркавання канстытуцыйных праектаў, у тым ліку на аснове прапаноў і заўваг розных ведамстваў, арганізацый, прадпрыемстваў, устаноў, а таксама грамадзян.

**Матэрыял і метады.** Крыніцазнаўчую базу даследавання складаюць арыгінальныя дакументы фондаў Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь. У прыватнасці, гэта стэнаграмы пасяджэнняў сесій Вярхоўнага Савета XII склікання, матэрыялы Канстытуцыйнай камісіі (пратаколы пасяджэнняў, праекты Асноўнага Закона, заўвагі і прапановы да іх).

Метадалагічную аснову даследавання склаў сістэмны падыход, паводле якога канстытуцыйны працэс 1990–1994 гг. можна ўявіць у якасці пэўнай сістэмы з наступнымі элементамі (параметрамі): перадумовы новай Канстытуцыі; Канстытуцыйная камісія; праекты Канстытуцыі; заўвагі і прапановы; механізм і этапы прыняцця Канстытуцыі.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** *Перадумовы новай Канстытуцыі.* Сярод перадумоў будучай Канстытуцыі незалежнай Беларусі можна вылучыць некалькі. Па-першае, гэта гарбачоўская «перабудова» і незваротныя працэсы дэмакратызацыі і галоснасці, якія выявілі абуральны разрыў паміж палажэннямі Канстытуцыі СССР і саюзных рэспублік і рэальным становішчам спраў у грамадстве. Цэнтр і рэспубліканскія ўлады перайшлі да палітыкі «латання дзірак», г.зн. унясення ў канстытуцыі шматлікіх змяненняў і дапаўненняў. Напрыклад, у Канстытуцыю Беларускай ССР 1978 г. пачынаючы з 27 кастрычніка 1989 г. заканадаўцы ўнеслі звыш трох дзясяткаў змяненняў і дапаўненняў. Пры гэтым апошнія з іх былі

замацаваны 22 лютага 1994 г., г.зн. менш чым за месяц да прыняцця новага Асноўнага Закона. Бесперспектыўнасць такой практыкі станавілася ўсё больш яўнай, наспела неабходнасць іншай Канстытуцыі. Па-другое, Вярхоўны Савет Беларусі XII склікання абраны вясной 1990 г. на першых у гісторыі БССР альтэрнатыўных выбарах. Менавіта ў Вярхоўным Савеце гэтага склікання быў дадзены старт канстытуцыйнаму працэсу на аснове палітычнага плюралізму. Патрэцяе, прыняцце Вярхоўным Саветам Беларусі XII склікання шэрагу заканадаўчых актаў, якія заклалі падмурак незалежнасці рэспублікі, – Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце БССР ад 27 ліпеня 1990 г., Закона аб асноўных прынцыпах народаўладдзя ад 27 лютага 1991 г., Закона аб наданні Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце статуса Канстытуцыйнага Закона ад 25 жніўня 1991 г. і інш.

*Канстытуцыйная камісія.* Для распрацоўкі праекта Асноўнага Закона пастановай Вярхоўнага Савета ад 22 чэрвеня 1990 г. была створана Канстытуцыйная камісія на чале з кіраўніком Парламента М.І. Дземянцеем [6, арк. 207]. У састаў Канстытуцыйнай камісіі ўваходзіла 74 чалавекі: 63 дэпутаты Вярхоўнага Савета і 13 экспертаў.

Асноўнай формай працы камісіі сталі пасяджэнні, пратаколы якіх пачалі весціся з 10 чэрвеня 1991 г. Між іншым, М.П. Чудакоў сцвярджае, што першае пасяджэнне Канстытуцыйнай камісіі было 31 ліпеня 1990 г., а ўсяго адбылося 31 пасяджэнне [2, с. 222, 237].

Нягледзячы на тое, што Канстытуцыйная камісія ставіла даволі амбітную мэту, яна як орган мела слабыя бакі. Канстытуцыйная камісія не ажыццяўляла ніякіх кантрольных функцый, у яе адсутнічалі рычагі ўздзеяння і ўплыву. Нездарма многія дэпутаты канстатавалі, што «меркаванне Канстытуцыйнай камісіі не ўлічваецца нават на ўзроўні рэкамендацый» [7, арк. 36]. Яны прапаноўвалі павысіць статус Канстытуцыйнай камісіі, надзяліўшы яе правам канстытуцыйнага нагляду за законапраектамі, правам канчатковага голасу па спрэчках паміж дзяржаўнымі органамі і інш.

Наступная праца Канстытуцыйнай камісіі паказала немэтазгоднасць такой колькасці яе членаў. Ніколі склад Канстытуцыйнай камісіі не збіраўся цалкам. За выключэннем некалькіх выпадкаў колькасны склад Канстытуцыйнай камісіі практычна не збіраўся нават пры неабходным – 38 членаў – кворуме пры прыняцці рашэнняў.

Таксама вельмі часта меў месца такі парадокс: тыя дэпутаты, якія не ўдзельнічалі ў папярэднім пасяджэнні камісіі, прыходзілі на наступнае і пачыналі крытыкаваць ужо зацверджаныя палажэнні праекта Асноўнага Закона, што ўносіла пэўны элемент дэстабілізацыі ў канстытуцыйны працэс.

Акрамя таго, не быў дасканала прадуманы механізм узаемадзеяння паміж дэпутатамі і ўласна экспертамі. Справа ў тым, што з пачаткам канстытуцыйнага працэсу дэпутаты, за выключэннем В.Ф. Голубева і М.А. Толсціка, амаль цалкам адышлі ад працы над праектам, які ствараўся намаганнямі экспертаў. Калі ж, у сваю чаргу, праект выносіўся на разгляд парламентарыяў, тыя ўносілі такія праўкі, якія па многіх параметрах нівеліявалі праект.

Сур'ёзнай перашкодай на шляху да новай Канстытуцыі Беларусі было тое, што ў рэспубліцы адсутнічаў самастойны вопыт распрацоўкі падобных дакументаў. Раней праекты заканадаўчых актаў "спускаліся" ў Вярхоўны Савет альбо з ЦК КПБ, альбо з Масквы. Дэпутаты дзейнічалі ў якасці статыстаў, паслухмяна зацвярджаючы гэтыя праекты. Шмат каму з дэпутатаў увогуле не была вядома такая рэч, як законатворчая тэхніка ці праватворчы працэс.

На канстытуцыйны працэс негатыўна ўплывалі і палітычныя прычыны. І адна з іх была ў складзе Вярхоўнага Савета XII склікання. Абраны шляхам больш-менш дэмакратычных выбараў, гэты Вярхоўны Савет з-за адсутнасці моцных партыйных фракцый не быў класічнай парламенцкай структурай. У ім пераважалі дэпутаты, многія з якіх, будучы членамі Канстытуцыйнай камісіі, прытрымліваліся абсалютна супрацьлеглых поглядаў на дзяржаўны лад Беларусі. Пры такім варыянце перспектыва знайсці сярод гэтых парламентарыяў кампрамісны варыянт наконт таго ці іншага пытання па распрацоўцы новай Канстытуцыі была вельмі слабая.

З мэтай паляпшэння эфектыўнасці працы над праектам Асноўнага Закона ў Канстытуцыйнай камісіі былі створаны дзве падкамісіі з вызначанай фіксаванай колькасцю членаў. Абедзве падкамісіі істотна адрозніваліся па складзе. Па вобразным выразе М.І. Дземянцея, адна падкамісія была «адміністрацыйна-камандная з былых камуністаў», іншая – «з прагрэсіўных людзей» [8, арк. 47].

У сваю чаргу, кожная падкамісія складалася з рабочай групы і групы экспертаў. Канчаткова такая структура была юрыдычна

зацверджана Вярхоўным Саветам 22 лістапада 1990 г. [9].

У працоўную групу першай падкамісіі ўвайшлі вядомыя і вопытныя юрыстыдзяржаўнікі: В.А. Бараўцоў (начальнік юрыдычнага аддзела Упраўлення справамі Савета Міністраў БССР), Г.А. Васілевіч (начальнік аддзела па пытаннях заканадаўства і правапарадку Сакратарыята Вярхоўнага Савета БССР), Б.М. Гадуноў (дэкан юрыдычнага факультэта БДУ), Н.А. Кудзінаў (начальнік кафедры дзяржаўна-прававых дысцыплін Мінскай вышэйшай школы МУС), В.Г. Ціхіня (народны дэпутат БССР, міністр юстыцыі БССР), І.А. Юхо (прафесар БДУ).

Не менш значным выглядаў і спіс экспертаў падкамісіі № 1. У яго ўвайшлі вядучыя юрысты рэспублікі, кандыдаты і дактары навук: А.А. Галаўко, В.А. Кучынскі, С.Ф. Сокал, А.Ц. Лейзераў, М.П. Чудакоў, В.І. Шабайлаў, А.В. Матусевіч, В.І. Семянкоў.

Падкамісія № 2 выглядала наступным чынам – члены рабочай групы, народныя дэпутаты БССР: Я.М. Глушкевіч, Л.У. Зданевіч, В.Ф. Какоўка, М.К. Крыжаноўскі, М.А. Тоўсцік. Група экспертаў: Л.А. Бейнаровіч, А.Я. Вашкевіч, Д.У. Драгун, С.Я. Леўшуноў, В.Я. Лубоўскі, М.І. Пастухоў, М.В. Пухонта, М.Н. Сатоліна, Д.Я. Тагуноў, А.Т. Шырокаў.

У ліпені 1991 г. на аснове двух падкамісій была створана адзіная Рабочая група Канстытуцыйнай камісіі. 20 ліпеня 1991 года адбылося першае – па архіўнай стэнаграме – пасяджэнне Рабочай групы Канстытуцыйнай камісіі ў абноўленым складзе. Усяго некалькі такіх пасяджэнняў прайшло да 24 ліпеня 1991 г. уключна, калі былі разгледжаны апошнія палажэнні праекта Канстытуцыі, якія адносіліся да фінансава-крэдытнай сістэмы рэспублікі, а таксама парадак дзеяння Канстытуцыі.

Адно з самых буйных пасяджэнняў Канстытуцыйнай камісіі прайшло 29 кастрычніка 1992 г. На ім сташынстваваў новы кіраўнік – С.С. Шушкевіч, які быў абраны на гэтую пасаду 28 кастрычніка 1992 г.

Напачатку С.С. Шушкевіч даручыў высветліць узровень наведвальнасці пасяджэнняў Канстытуцыйнай камісіі. Калі разам звялі ўсе дадзеныя, карціна атрымалася сумная. З чэрвеня 1991 па кастрычнік 1992 г. усе трынаццаць пасяджэнняў камісій наведалі В.А. Бараўцоў і Г.А. Васілевіч, дванаццаць пасяджэнняў – М.Ф. Чудакоў, В.А. Піскароў, адзінаццаць – В.Ф. Голубеў, дзесяць – Н.І. Дзямянцей, В.І. Шаладонаў. Лідар парламенцкай апазіцыі БНФ З.С. Пазьняк наведаў толькі адно пасяджэнне камісіі [10, арк. 105].

У лістападзе 1992 г. склад Канстытуцыйнай камісіі істотна абнавіўся па некалькіх прычынах. Па-першае, смерць некаторых членаў камісіі (Н.А. Кудзінаў, Г.Т. Мілаванаў); па-другое, датэрміновае складанне паўнамоцтваў шэрагу парламентарыяў (Я.Я. Сакалоў, С.М. Шабашоў); па-трэцяе, уласнае жаданне дэпутатаў, так як вызначыліся тыя, хто вырашыў сысці з яе і, наадварот, стаць новым членам.

Напрыклад, дваццаць пяць дэпутатаў Вярхоўнага Савета XII склікання падалі заявы аб выключэнні іх са складу Канстытуцыйнай камісіі. Дваццаць дзевяць дэпутатаў падалі заявы аб уключэнні іх у склад Канстытуцыйнай камісіі.

11 лістапада 1992 г. Вярхоўны Савет зацвердзіў пастанову «Аб змяненні ў складзе Канстытуцыйнай камісіі» [11, арк. 50–52]. Згодна з пастановай з 74 членаў камісіі выбыла 15 чалавек, увайшло ў склад камісіі 17 чалавек. Колькасць членаў Канстытуцыйнай камісіі склала 76 чалавек. Апошняе змяненне ў складзе адбылося ўвосень 1993 г. і было звязана са смерцю дэпутата Дз.А. Арцымені, які загінуў ад рук наёмнага забойцы. Месца Дз.А. Арцымені ў Канстытуцыйнай камісіі так і засталося вакантным.

Фармальна сваё існаванне Канстытуцыйная камісія скончыла 15 сакавіка 1994 г., калі і была прынята Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь. Ніякай спецыяльнай пастановы наконт спынення паўнамоцтваў Канстытуцыйнай камісіі Парламентам прынята не было. Згодна з Часовым Рэгламентам Вярхоўнага Савета ад 31 мая 1990 г. часовая камісія, якой і з’яўлялася Канстытуцыйная камісія, аўтаматычна спыняла сваю дзейнасць, калі выканала сваю задачу.

*Праекты Канстытуцыі.* У фондах Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь маецца каля дзясятка канстытуцыйных праектаў са шматлікімі зменамі і праўкамі. У рамках дадзенага артыкула ўсе іх аналізаваць няма магчымасці, таму больш мэтазгодна спыніцца на ключавых палажэннях тых праектаў, якія публікаваліся для абмеркавання ў рэспубліканскім друку. Такіх публікацый было тры: у снежні 1991 г. [12], жніўні 1992 г. [13] і верасні 1993 г. [14].

«Снежаньскі» праект складаўся з прэамбулы, 9 раздзелаў, 9 главаў і 170 артыкулаў. «Жнівеньскі» праект меў прэамбулу,

10 раздзелаў, 6 главаў і 170 артыкулаў. Нарэшце, канструкцыя «вераснёўскага» праекта будавалася на прэамбуле, 8 раздзелах, 8 главах і 152 артыкулах.

Гэтыя праекты былі рознымі па якасці. У іх можна вызначыць як станоўчыя моманты, так і істотныя недахопы.

Відавочныя такія канцэптуальныя перавагі праектаў над дзеючай Канстытуцыяй 1978 г., як больш стройная і лагічная структура, удалая фармулёўка раздзелаў і главаў, адпаведная групоўка тых ці іншых палажэнняў, адсутнасць прапагандысцкай дэмагогіі.

Да недахопаў можна аднесці звышпільную ўвагу заканадаўцаў да правоў і абавязкаў грамадзян, і адпаведна меншую – да палажэнняў аб раздзяленні ўладаў, дзяржаўным ладзе рэспублікі, імкненне да кампіляцыі, а не да асэнсавання найбольш спрэчных і складаных момантаў канстытуцыйнага праекта, схільнасць не вырашаць гэтыя складанасці, хаваць іх пад адсылачнымі нормамі кшталту таго, што тыя ці іншыя пытанні рэгулююцца законам.

Канстытуцыйныя праекты сведчылі пра сталае ваганне большасці дэпутацкага корпуса наконт прынцыповых палажэнняў, напрыклад, прэзідэнцтва. Так, «снежаньскі» праект уводзіў інстытут «моцнага» Прэзідэнта, які адначасова з'яўляўся кіраўніком дзяржавы і выканаўчай улады. Больш таго, Прэзідэнт абвяшчаўся гарантам суверэнітэту, нацыянальнай бяспекі і тэрытарыяльнай цэласнасці, правоў і свабод грамадзян. Пункт 1 артыкула 105 праекта надзяліў кіраўніка дзяржавы правам рабіць захады па ахове суверэнітэту, нацыянальнай бяспекі і тэрытарыяльнай цэласнасці рэспублікі.

А вось «жнівеньскі» праект адназначна замацаваў «слабага» Прэзідэнта, які з гэтага часу з'яўляўся толькі кіраўніком дзяржавы. Палажэнне аб тым, што Прэзідэнт прымае меры, накіраваныя на забеспячэнне нацыянальнай бяспекі, суверэнітэту і тэрытарыяльнай цэласнасці, было ўвогуле выключана.

Аўтары «вераснёўскага» праекта зноў вярнуліся да ідэі «моцнага» Прэзідэнта, надзяліўшы яго істотнымі паўнамоцтвамі. Прэзідэнт зноў станавіўся кіраўніком не толькі дзяржавы, але і выканаўчай улады. Была рэанімiравана норма аб мерах па ахове суверэнітэту, нацыянальнай бяспекі і тэрытарыяльнай цэласнасці рэспублікі. Прэзідэнт атрымліваў правы ствараць і касаваць міністэрствы, ведамствы і іншыя цэнтральныя органы кіравання. Пры Прэзідэнце ствараўся Урад – Кабінет Міністраў.

Канешне, толькі прэзідэнцтвам кола спрэчных пытанняў у канстытуцыйных праектах не абмяжоўвалася. Яно было вельмі шырокае і тычылася: прэамбулы (мэтазгоднасць пералічэння ў ёй перыядаў і заканадаўчых актаў у гісторыі Беларусі); адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу рэспублікі, статуса дзяржаўнай мовы, прафесійнага ці непрафесійнага Парламента, яго колькасці і назвы, статуса і паўнамоцтваў Канстытуцыйнага Суда, механізму прызначэння суддзяў абласных, раённых і гарадскіх судоў, колькасці суб'ектаў, маючых права заканадаўчай ініцыятывы, права пракуратуры на следчыя дзеянні і інш.

*Заўвагі і прапановы.* На пасяджэнні Канстытуцыйнай камісіі 21 мая 1992 г. В.І. Шаладонаў заявіў, што пасля публікацыі першага праекта паступіла 3534 заўваг і прапаноў, з якіх 1892 насілі рэдакцыйны характар. Па словах В.І. Шаладонава, па прэамбуле праекта паступіла 35 прапаноў і заўваг [15, арк. 7–8].

Перад паартыкульным галасаваннем па праекце Канстытуцыі ў траўні 1993 г. С.С. Шушкевіч агучыў наступныя лічбы: усяго за 1991–1992 гг. паступіла 11 тыс. асабістых заўваг і прапаноў і 1 млн – калектыўных [3, с. 81]. Гэта была досыць высокая актыўнасць, улічваючы, што ўладамі не выкарыстоўваўся адміністрацыйны рэсурс. На жаль, няма статыстычных дадзеных аб колькасці заўваг і прапаноў у 1993 – пачатку 1994 г. Хутчэй за ўсё, іх было няшмат. Грамадская цікавасць да канстытуцыйнага праекта ў гэты час рэзка ўпала не ў апошнюю чаргу з-за самога Вярхоўнага Савета XII склікання, які імкліва губляў папулярнасць сярод насельніцтва.

Паступілі заўвагі і прапановы, якія можна ранжыраваць наступным чынам: заўвагі і прапановы дэпутатаў Вярхоўнага Савета, членаў Канстытуцыйнай камісіі, экспертаў Канстытуцыйнай камісіі; заўвагі і прапановы арганізацый, устаноў, прадпрыемстваў; заўвагі і прапановы палітычных партый, грамадскіх аб'яднанняў; заўвагі і прапановы асобных грамадзян Рэспублікі Беларусь. Якія ж палажэнні праектаў выклікалі найбольшую цікавасць?

Заўвагі і прапановы тычыліся назвы рэспублікі, прэамбулы, інстытута прэзідэнцтва, парламента, мовы, адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу, сістэмы мясцовага кіравання і самакіравання, судовай сістэмы, Канстытуцыйнага Суда, правоў і свабод грамадзян і інш. Нягледзячы на разнастайнасць

заўваг і прапаноў, можна зрабіць выснову: пераважная частка насельніцтва вельмі асцярожна ставілася да радыкальных нова-ўвядзенняў у будучай Канстытуцыі (асабліва інстытут прэзідэнцтва), выступала за захаванне тых сацыяльных стандартаў – бясплатнае жыллё, адукацыя і медыцына і г.д., якія былі прапісаны ў Канстытуцыі 1978 г.

Асцярожнасць выяўлялася нават у тэрміналогіі. Напрыклад, большасць прапаноў была скіравана на перайменаванне Вярхоўнага Савета ў Сойм, супраць сцвярджэння ў праекце тэрмінаў, запазычаных з замежных моў («унітарызм» і інш.).

У рамках артыкула немагчыма разледзець усе заўвагі і прапановы па канстытуцыйных праектах. Безумоўна, яны з’яўляюцца цікавым аб’ектам навуковага вывучэння, дазваляюць рэканструяваць грамадскія перавагі і настрой таго часу.

*Механізм і этапы прыняцця Канстытуцыі.* Механізм прыняцця Канстытуцыі меў іерархічны характар.

Першым захадам было зацвярджэнне праекта на пасяджэнні Канстытуцыйнай камісіі. Гэта адбылося 30 верасня 1991 г. [3, с. 51].

Другі крок – разгляд і зацвярджэнне праекта ў першым чытанні на пасяджэнні сесіі Вярхоўнага Савета. 11 лістапада 1991 г. праект у цэлым быў ухвалены большасцю дэпутатаў, у тым ліку і прадстаўнікамі парламенцкай апазіцыі Беларускага народнага фронта (БНФ). Дэпутаты не скупіліся на пахвалу праекта, які, на іх думку, адказваў узроўню сусветнай юрыдычнай думкі. 11 лістапада толькі адзіны дэпутат Вярхоўнага Савета Беларусі ХІІ склікання – В.С. Трафіменка – выказаўся супраць зацвярджэння праекта Канстытуцыі ў першым чытанні і публікацыі яго ў друку [16, с. 66].

Абмеркаванне канстытуцыйнага праекта ў другім чытанні прайшло ў Вярхоўным Савеце 23 і 27 кастрычніка 1992 г. Але ніякай пастановы парламентарыі ў гэтыя дні не прынялі, што было відавочным парушэннем Часовага Рэгламенту, згодна з якім законапраект у другім чытанні павінен быць ухвалены альбо не.

Толькі 29 кастрычніка 1992 г. Вярхоўны Савет прыняў спецыяльную заяву аб неабходнасці паскарэння канстытуцыйных пераўтварэнняў у рэспубліцы. Заява замацоўвала больш-менш дакладны – не пазней 1993 г. – тэрмін прыняцця Канстытуцыі [3, с. 44].

На падставе гэтай заявы 20 студзеня і 5 лютага 1993 г. ажыццявілі рэйтынгавае галасаванне па найбольш спрэчных палажэннях канстытуцыйнага праекта. У свой час такі механізм прапанаваў дэпутат Вярхоўнага Савета, старшыня сталай камісіі па заканадаўстве Дз.П. Булахаў. Гэта дапамагло знайсці хісткі кансэнсус і найдалей працягваць працу над праектам.

5 лютага 1993 г. была зацверджана пастанова «Аб праекце Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь». Асноўныя палажэнні пастановы выглядалі наступным чынам: 1) дзяржава грунтуецца на прынцыпе падзелу ўлад; 2) вышэйшы орган дзяржаўнай улады – Вярхоўны Савет, частка дэпутатаў якога можа працаваць на пастаяннай аснове, а іншая сумяшчае дэпутацкія абавязкі з вытворчай або службовай дзейнасцю; 3) Беларусь – прэзідэнцкая рэспубліка, у якой Прэзідэнт – кіраўнік выканаўчай улады; 4) пяцігадовы тэрмін дзейнасці Вярхоўнага Савета; 5) мясцовае самакіраванне ажыццяўляецца грамадзянамі праз мясцовыя прадстаўнічыя органы, мясцовыя рэферэндумы, сходы грамадзян і іншыя формы прамога ўдзелу насельніцтва ў грамадскіх справах, у межах кампетэнцыі, прадстаўленай ім законам; 6) дзяржаўныя гарантыі ўсім грамадзянам роўных правоў для ажыццяўлення гаспадарчай і іншай дзейнасці, стварэнне аднолькавых умоў для развіцця ўсіх формаў уласнасці; 7) даступнасць бясплатнага медыцынскага абслугоўвання і бясплатнай адукацыі ў дзяржаўных установах [3, с. 82–83].

Лейтматывам пастановы праходзіла ідэя паартыкульнага абмеркавання праекта Канстытуцыі, якое павінна было ажыццявіцца на працягу 1993 г. Паартыкульным абмеркаваннем прынята лічыць механізм разгляду і зацвярджэння частак канстытуцыйнага праекта ў вызначаным парадку – прэамбула, раздзел, глава, артыкул – не менш чым 2/3 галасоў. Справа ў тым, што на момант пачатку паартыкульнага абмеркавання Вярхоўны Савет ХІІ склікання налічваў 345 дэпутатаў. Гэта значыць, што для станоўчага зацвярджэння новага артыкула патрэбна было набраць 231 голас. І гэта пры тым, што на пасяджэннях сесіі прысутнічала максімум 260–280 дэпутатаў.

Паартыкульнае абмеркаванне падзяляецца на два этапы: з 19 па 27 мая 1993 г. і з 30 лістапада па 1 снежня 1993 г. Перад пачаткам паартыкульнага абмеркавання дэпутаты дапусцілі сур’ёзны пралік, не апублікаваўшы адпаведны канстытуцыйны праект.

Сітуацыя ў Авальнай зале падчас майскага паартыкульнага абмеркавання была напружана

вельмі моцна ў літаральным сэнсе гэтага слова. Кожнае палажэнне Канстытуцыі – ці то раздзел, ці то артыкул – зацвярджаліся з цяжкасцю. У гэтым сваю ролю выконвалі не толькі ідэйныя рознагалоссі дэпутатаў, але і сапраўдны сабатаж з боку многіх парламентарыяў. Часта для зацвярджэння не хапала аднаго-двух галасоў. Дэпутаты зразумелі, што больш хуткае прыняцце Канстытуцыі азначае новыя выбары, а таксама страту мандата і звязаных з ім прывілеяў.

У выніку на майскім паартыкульным абмеркаванні было разгледжана 109 артыкулаў і цалкам зацверджаны 62 артыкулы, часткова – прэамбула і 22 артыкулы [3, с. 101]. Таксама былі зацверджаны назвы раздзелаў: «Асновы канстытуцыйнага ладу», «Асоба, грамадства і дзяржава», «Выбарчая сістэма, рэферэндум», «Заканадаўчая, выканаўчая і судовая ўлада», «Фінансавая сістэма», «Дзеянне Канстытуцыі і парадак яе змены».

17 чэрвеня 1993 г. рабочая група В.І. Шаладонава вынесла на галасаванне наступныя варыянты будучай Канстытуцыі: Беларусь – прэзідэнцкая рэспубліка, дзе Прэзідэнт – кіраўнік дзяржавы і выканаўчай улады; Прэзідэнт – кіраўнік дзяржавы, але не кіраўнік выканаўчай улады; Беларусь – парламенцкая рэспубліка. Большасць галасоў набраў першы варыянт [17, с. 166].

У адказ на гэта парламенцкая апазіцыя БНФ апублікавала спецыяльную заяву «Аб Канстытуцыі». На думку апазіцыі, будучая Канстытуцыя павінна адлюстроўваць наступныя палажэнні: парламенцкая рэспубліка, у якой Прэзідэнт – кіраўнік дзяржавы; нейтралітэт і бяз'ядзерны статус; Парламент, які дзейнічае на пастаяннай аснове, муніцыпальная сістэма мясцовага кіравання. Апазіцыя таксама настойвала на дзяржаўным статусе беларускай мовы, недапушчальнасці двухмоўя і таталітарнай палітыкі русіфікацыі, на неабходнасці ўвядзення прыватнай уласнасці на зямлю і нацыянальнай валюты, на вяртанні гістарычнай назвы сталіцы (Менск). Без гэтых палажэнняў, сцвярджала апазіцыя, Канстытуцыя «губляе ўсякі стваральны сэнс» [3, с. 102].

Складаная сітуацыя з паартыкульным абмеркаваннем прымушала шукаць С.С. Шушкевіча новыя спосабы хутчэйшага зацвярджэння праекта Канстытуцыі. У верасні 1993 г. Старшыня Вярхоўнага Савета разаслаў кожнаму дэпутату спецыяльную запіску. У ёй С.С. Шушкевіч прапанаваў зацвердзіць праект Асноўнага Закона на Канстытуцыйнай Асамблеі, якая складалася з 310 членаў, якія не з'яўляюцца дэпутатамі Вярхоўнага Савета і выбіраюцца насельніцтвам пры яўцы ў 25%. Канстытуцыйная Асамблея павінна была, на думку С.С. Шушкевіча, на працягу чатырох месяцаў прыняць Канстытуцыю [3, с. 102–103].

Прапанова С.С. Шушкевіча была парушэннем дзеючай Канстытуцыі 1978 г., якая прадугледжвала прыняцце Канстытуцыі выключна Вярхоўным Саветам. Ініцыятыва С.С. Шушкевіча не знайшла падтрымкі ў дэпутатаў, так як яго становішча пахіснулася. Большасць дэпутатаў толькі і чакалі моманту, каб адклікаць Старшыню з пасады.

На другім этапе паартыкульнага абмеркавання было зацверджана 26 артыкулаў праекта. У выніку колькасць прынятых артыкулаў склала 88 [3, с. 104]. Таксама былі прыняты назвы астатніх раздзелаў і кіраўнікоў, а таксама прэамбула. Не была зацверджана назва адзінай главы – аб Прэзідэнце. 1 снежня 1993 г. яна набрала 219 галасоў [3, с. 108].

Тады дэпутаты прапанавалі ідэю стварэння так званай Пагаджальнай камісіі. Яе члены павінны былі весці адпаведную прафілактычную працу з тымі дэпутатамі, якія выступалі супраць прэзідэнцтва. У склад Пагаджальнай камісіі, зацверджаны 2 снежня 1993 г., увайшлі: Б.Г. Гетц, М.Ф. Грынёў, І.М. Драбышэўская, В.І. Зяленін, Н.Я. Ізвалава, Г.Дз. Карпенка, М.А. Качан, У.П. Кулакоў, М.А. Мачуленка, З.С. Пазьняк, А.Ф. Спіглазаў, І.І. Сямашка, А.А.Трусаў, В.В. Чэпік [3, с. 109].

Праца Пагаджальнай камісіі практычна нічога не дала. Дэпутаты казалі аб поўным яе правале і канстатавалі тое, што канстытуцыйны працэс тармозіцца штучна, мае месца сітуацыя, калі «максімум калектыўнай дэмагогіі і мінімум індывідуальнай адказнасці задавальняе кіраўніцтва» [3, с. 110].

Станавілася зразумела, што зацягваць канстытуцыйны працэс немэтазгодна. Паўнамоцтвы Вярхоўнага Савета міналі, а кіруючая эліта мела патрэбу ў такім прававым фармаце, які б дазволіў ажыццявіць уласны, спрыяльны сцэнарый выбараў. У гэтым асабліва быў зацікаўлены Прэм'ер-міністр В.Ф. Кебіч, які разглядаўся ў якасці рэальнага кандыдата на прэзідэнцкі пост.

19 студзеня 1994 г. кіраўнік дэпутацкага аб'яднання "Беларусь" Г.І. Казлоў выступіў з незвычайнай ініцыятывай. Ён прапанаваў прыняць найбольш спрэчныя палажэнні пра-

екта Канстытуцыі не электронным, а паіменным галасаваннем: кожнаму дэпутату пад роспіс выдаецца бюлетэнь з пытаннямі. Сам дэпутат можа на працягу некалькіх дзён абдумаць і здаць бюлетэнь [3, с. 111]. Гэтую ідэю падтрымала кіраўніцтва Вярхоўнага Савета ў асобе С.С. Шушкевіча і большасць дэпутацкага корпуса.

Супраць імяннога галасавання рэзка выступіла апазіцыя БНФ, якая даказвала, што галасаванне павінна быць бесперапынным [3, с. 116]. Аднак з юрыдычнага пункту гледжання ініцыятары імяннога галасавання мелі рацыю. Так, пункт другі артыкула 97 дзеючай Канстытуцыі БССР 1978 г. абвяшчаў, што Вярхоўны Савет правамоцны прыняць да свайго разгляду і вырашыць любое пытанне, якое знаходзіцца ў кампетэнцыі рэспублікі.

Непазбежнасць імяннога галасавання стала яшчэ больш відавочнай пасля адклікання С.С. Шушкевіча з пасады Старшыні Вярхоўнага Савета 26 студзеня 1994 г. і абрання на гэты пост 28 студзеня 1994 г. М.І. Грыба. 1 лютага 1994 г. М.І. Грыб стаў кіраўніком Канстытуцыйнай камісіі. М.І. Грыб ультыматыўна заявіў, што калі Канстытуцыя не будзе прынята Парламентам, ён ініцыіруе рэферэндум [3, с. 116].

Для арганізацыі паіменнага галасавання 22 лютага 1994 г. была сфарміравана Падліковая камісія. Камісія раздала дэпутатам імянныя бюлетэні, у якіх парламентарый павінен быў выказаць сваё стаўленне да главы 3 канстытуцыйнага праекта «Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь», да главы 4 «Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь» і да раздзела V «Мясцовае кіраванне і самакіраванне» [18].

Паіменнае галасаванне адбылося 24, 25 лютага і 1 сакавіка 1994 г. 2 сакавіка 1994 г. былі абвешчаны вынікі. З унесеных у спіс 346 дэпутатаў бюлетэні ўзялі 296. У скрыні аказалася 288 бюлетэняў. 266 бюлетэняў – «за», 16 – «супраць». Яшчэ 6 бюлетэняў былі прызнаныя несапраўднымі [3, с. 119].

У Нацыянальным архіве захаваўся ўнікальны дакумент – спіс дэпутатаў з фіксаваным часам выдачы парламентарыю бюлетэня і вяртання яго ў камісію. Так, будучы Прэзідэнт А.Р. Лукашэнка ўзяў бюлетэнь 24 лютага 1994 г. у 12:00 і вярнуў яго ў 12:05 гэтага ж дня [3, с. 117].

Некаторыя дэпутаты не вярнулі ўзятыя імі бюлетэні. Не вярнуў бюлетэнь С.С. Шушкевіч. Пазней былы кіраўнік Парламента крытыкаваў паіменнае галасаванне, мяркуючы, што нельга «адным махам» прымаць 38 артыкулаў [3, с. 120].

Пасля паіменнага галасавання канстытуцыйны працэс выйшаў на фініш. Па словах В.І. Шаладонава, пасля імяннога галасавання засталіся непрынятымі 20 артыкулаў [3, с. 121]. З 2 па 4 сакавіка 1994 г. дэпутаты прынялі гэтыя артыкулы, прычым найбольш спрэчнымі былі тыя, што адносіліся да статусу беларускай мовы (арт. 17) і адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу (арт. 9). 4 сакавіка 1994 г. Вярхоўны Савет прыняў рашэнне, згодна з якім усе папраўкі да праекта Канстытуцыі ў пісьмовым выглядзе падаваліся да 5 сакавіка ўключна.

Гэтыя папраўкі разглядаліся дэпутатамі 15 сакавіка 1994 г. і тычыліся колькасці членаў Парламента (275 замест 260), надання Кантрольнай палаце права заканадаўчай ініцыятывы, абрання першага Прэзідэнта на тры гады і інш.

У разгар дыскусій М.І. Грыб прапанаваў прагаласаваць за праект Канстытуцыі цалкам. Для галасавання зарэгістраваліся 307 дэпутатаў пры кворуме ў 231 чалавек для прыняцця рашэнняў. З 250 тых, хто прагаласаваў, 236 выказаліся «за», 6 – «супраць», 8 устрымаліся, 57 не галасавалі наогул [3, с. 132–133].

**Заключэнне.** Такім чынам, канстытуцыйны працэс на ўсім працягу 1990–1994 гг. быў забяспечаны ў арганізацыйна-матэрыяльным, прававым і навукова-інтэлектуальным плане. Упершыню за ўсю гісторыю стварэння беларускіх канстытуцый ў 1990–1994 гг. былі прыцягнутыя высокакваліфікаваныя кадры, кандыдаты і дактары навук.

Публічнасць канстытуцыйнага працэсу, апублікаванне праектаў Канстытуцыі ў сродках масавай інфармацыі выклікалі даволі шырокі грамадскі інтарэс. Заўвагі і прапановы дапамагалі паляпшэнню канстытуцыйнага праекта змястоўна і стылістычна.

Тым не менш, канстытуцыйны працэс у 1990–1994 гг. не пазбег калізій. Шмат у чым яны былі звязаны і са стылем работы Вярхоўнага Савета XII склікання. Гэты стыль характарызаваўся зацягваннем прыняцця важных рашэнняў, бясконцымі кансультацыямі і ўзгадненнямі. Наглядна гэта выявілася ў паартыкульным абмеркаванні праекта Канстытуцыі. Экстраардынарны прыём – паіменнае галасаванне, да якога вымушаны былі звярнуцца дэпутаты, – сведчыў аб тупіковасці канстытуцыйнага працэсу.

Галоўная мэта канстытуцыйнага працэсу на Беларусі, пачынаючы з 1994 г., была дасягнута. Новы Асноўны Закон рэспублікі быў ухвалены Вярхоўным Саветам. Але шлях да Канстытуцыі незалежнай Беларусі аказаўся вельмі складаным. Сваю ролю тут адыгралі розныя фактары: недысцыплінаванасць многіх парламентарыяў, іх палітычныя і асабістыя ўзаемаадносіны, прафесійная непадрыхтаванасць і інш. І ўсе ж дэпутаты Вярхоўнага Савета XII склікання змаглі пераадолець амбіцыі і прыняць Канстытуцыю Беларусі. У гэтым іх безумоўная гістарычная заслуга.

## Літаратура


1. Василевич, Г.А. Создание новой Конституции – важнейший этап работы белорусского парламента / Г.А. Василевич // Вест. Конституционного суда Респ. Беларусь. – 1995. – № 2–3. – С. 133–149.
2. Чудаков, М.Ф. Конституционный процесс в Беларуси (от привилея Казимира до Конституции Республики Беларусь) / М.Ф. Чудаков. – Минск: Академия управления при Президенте Респ. Беларусь, 2008. – 290 с.
3. Курьянович, А.В. Конституция независимой Беларуси: разработка, проекты, принятие / А.В. Курьянович. – 3-е изд. – Минск: Тесей, 2012. – 176 с.
4. Курьянович, А.В. Конституция независимой Беларуси: разработка, проекты, принятие / А.В. Курьянович // Иппокрена. – 2008. – № 2. – С. 96–107.
5. Каваленя, А.А. Рэспубліка Беларусь у даследваннях вучоных Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі / А.А. Каваленя // Рэспубліка Беларусь. 20 год незалежнасці: зб. матэрыялаў міжнар. навук.-практ. канф. / Інстытут гісторыі НАН Беларусі, Мінск, 24–25 ліст. 2011 г.; рэдкал.: А.А. Каваленя [і інш.]. – Мінск: Беларус. навука, 2012. – С. 12–19.
6. Пратакол № 40, пратаколы рэгістрацыі і галасавання, стэнаграма, бюлетэнь № 40, саракавога паседжання 1-й сесіі Вярхоўнага Савета БССР дванаццатага склікання ад 22 чэрвеня 1990 г. // Нац. архіў Рэсп. Беларусь. – Фонд 968. – Воп. 1. – Спр. 2775. – 299 арк.
7. Пратаколы № 1–5, стэнаграмы пасяджэння Канстытуцыйнай камісіі, 10 чэрвеня – 11 ліпеня 1991 г. // Нац. архіў Рэсп. Беларусь. – Фонд 968. – Воп. 1. – Спр. 3731. – 177 арк.
8. Пратакол № 11, пратаколы рэгістрацыі і галасавання, стэнаграма, бюлетэнь № 11 адзінаццатага паседжання 10-й сессии Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь XII склікання ад 28 кастрычніка 1992 г. // Нац. архіў Рэсп. Беларусь. – Фонд 968. – Воп. 1. – Спр. 3099. – 220 арк.
9. Аб зацвярджэнні рашэння Канстытуцыйнай камісіі па падрыхтоўцы праекта Канстытуцыі (Асноўнага Закона) Беларускай ССР «Аб рабочай групе і групе экспертаў для падрыхтоўкі праекта Канстытуцыі (Асноў-нага закона) Беларускай ССР»: пастанова Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, 22 ліст. 1990 г., № 407-XII // Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэсп. Беларусь. – 1990. – № 1. – Арт. 3.
10. Пратаколы № 8–14, стэнаграмы пасяджэнняў Канстытуцыйнай камісыі і дакументы да іх, 22 мая 1992 г. – 25 мая 1993 г. // Нац. архіў Рэсп. Беларусь. – Фонд 968. – Воп. 1. – Спр. 3734. – 250 арк.
11. Законы і пастановы, прынятыя 10-й сесіяй Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь дванаццатага склікання і дакументы да іх, 11–12 ліст. 1992 г. // Нац. архіў Рэсп. Беларусь. – Фонд 968. – Воп. 1. – Спр. 2648. – 267 арк.
12. Канстытуцыя (Асноўны Закон) Рэспублікі Беларусь. Праект // Народная газета. – 1991. – 3 снеж. – С. 1–3.
13. Конституция (Основной Закон) Республики Беларусь. Проект // Народная газета. – 1992. – 22 авг. – С. 3–5.
14. Конституция (Основной Закон) Республики Беларусь. Проект // Советская Белоруссия. – 1993. – 28 сент. – С 1–3.
15. Пратакол № 7, стэнаграма паседжання Канстытуцыйнай камісіі і дакументы да іх, 21 мая 1992 г. // Нац. архіў Рэсп. Беларусь. – Фонд 968. – Воп. 1. – Спр. 3733. – 267 арк.
16. Сёмая сесія Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь дванаццатага склікання. Бюлетэнь № 25. – Выданне Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, 1991. – 83 с.
17. Василевич, Г.А. Парламент Республики Беларусь: конституционно-правовой аспект / Г.А. Василевич. – Минск: Право и экономика, 1995. – 358 с.
18. Аб правядзенні галасавання па асобных палажэннях праекта Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь шляхам падачы імянных бюлетэняў: пастанова Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, 22 лютага 1994 г., № 2802-XII // Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. – 1994. – № 8. – Арт. 100.


*Паступіў у рэдакцыю 05.06.2014 г.*

*Прыняты ў друк 21.07.2014 г.*